най самасвядомасці прад'яўляюцца высокія патрабаванні да маладых спецыялістаў сферы культуры, іх прафесійнай падрыхтоўкі. Канкурэнтаздольнасць выпускнікоў універсітэта культуры магчыма толькі пры ўмове высокага прафесіяналізму.

Адной з галоўных задач педагагічнага працэсу ў вышэйшай навучальнай установе з'яўляецца фарміраванне асобы спецыяліста, захопленага сваёй справай, узброенага неабходнымі ведамі, уменнямі, навыкамі.

Будучы спецыяліст павінен і сам актыўна ўдзельнічаць у працэсе свайго прафесійнага развіцця (выхаванне павінна пераходзіць у самавыхаванне), працаваць над сабой, выпраўляць заўважаныя ў сабе недахопы, выпрацоўваць прафесійныя і маральна-псіхалагічныя якасці.

Выхаванне наогул, а прафесійнае ў асаблівасці, ёсць абавязковая ўмова станаўлення самавыхавання, фарміравання прафесійнай самасвядомасці. Каб пачалося прафесійнае самавыхаванне, студэнт павінен усвядоміць свой прафесійны інтарэс і мець магчымасць яго задаволіць, прыкладаючы для гэтага неабходныя намаганні. Каб выхаванне перарастала ў самавыхаванне, трэба вызначыць унутраныя прадпасылкі гэтага працэсу і яго знешнія ўмовы. Да ліку ўнутраных прадпасылак, у прыватнасці, адносіцца высокі ўзровень самасвядомасці. Любая форма самаразвіцця і сама-ўдасканалення асобы ўключае актыўнае асэнсоўванне сябе і навакольнага свету. У самавыхаванні ўсведамляецца ўсё: уласная асоба, акалічнасці, вынікі дзейнасці, сам працэс фарміравання здольнасцей.

Пераход да больш высокіх форм самаразвіцця і самаўдасканалення асобы, у першую чаргу, прадугледжвае развіццё самасвядомасці і мыслення. Таму важным з'яўляецца не толькі працэс прафесійнага самавыхавання, але і фарміраванне прафесійнай самасвядомасці, усведамленне будучым спецыялістам сябе суб'ектам прафесійнай дзейнасці.

Якім чынам адбываецца прафесійнае станаўленне студэнта ў ВНУ, як фарміруецца яго прафесійная самасвядомасць? Гэта былі галоўныя пытанні даследавання, якое праводзілася намі ў 1992/93 навучальным годзе на факультэце БІС інстытута культуры.

Асноўныя метады даследавання -- тэарэтычны аналіз і анкетаванне, яны абумовілі крытэрый для вызначэння ступені сфарміраванасці прафесійнай накіраванасці ў студэнтаў і ступені сфарміраванасці ў іх прафесійнай самасвядомасці.

У якасці гэтага крытэрыя былі выбраны наступныя сістэмы паказчыкаў:

эмацыянальна-пазнавальныя адносіны да прафесіі, да навучальнай дзейнасці, да творчага зместу выбранай прафесіі;

актыўна-дзейсныя адносіны да падрыхтоўкі да прафесійнай дзейнасці, самаацэнка ўзроўню авалодання сістэмай прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў;

узровень сфарміраванасці прафесійнай самасвядомасці, самаацэнка ўзроўню сфарміраванасці прафесійнага мыслення.

Даследаваннем было ахоплена 122 студэнты, якія пачыналі навучанне на другім курсе, і тых, што заканчвалі першы курс (адпаведна аднолькавага ўзросту і атрыманых ведаў). Гэта дазваляе абагульніць вынікі на абодвух курсах.

Асэнсоўваючы сваю сутнасць і сэнс свайго «я», толькі 15,6% студэнтаў адчуваюць сябе будучымі бібліятэкарамі, 9,8% -- добрымі спецыялістамі, 4,9% -- будучымі спецыялістамі наогул, а 2,5% ужо лічаць сябе прафесіяналамі, 1,6% -- спецыялістамі шырокага профілю.

Многія (78%) усё ж адчуваюць сябе і студэнтамі. Але нягледзячы на гэта 58,6% студэнтаў «хутчэй не прафесійна, чым прафесійна», могуць асэнсоўваць прафесійныя задачы. 82,9% адказалі, што амаль не могуць назваць сябе спецыялістамі-прафесіяналамі. Нягледзячы на тое, што яны недастаткова часу адводзяць падрыхтоўцы да прафесійнай дзейнасці (48,8% -- недастаткова, 24,4% -- амаль зусім не), некаторыя студэнты (48,3%) адчуваюць, што для іх «дастаткова вялікае» значэнне маюць заняткі па авалоданню спецыяльнасцю. Турбуе, што 39% рэспандэнтаў адказалі, што заняткі па авалоданню спецыяльнасцю для іх маюць невялікае значэнне.

Перад намі частка першых вынікаў даследавання, якія толькі вызначылі праблему фарміравання прафесійнай самасвядомасці студэнтаў.

Далей будуць даследавацца працэс фарміравання прафесійнай самасвядомасці ад першага да апошняга курса навучання студэнтаў, уплыў спецыяльных дысцыплін і працоўнай практыкі на яго, а таксама шляхі фарміравання прафесійнай самасвядомасці на больш высокім узроўні.

Праведзенне даследавання сведчыць аб неабходнасці распрацоўкі комплексу псіхолага-педагагічных мер па фарміраванню у будучых спецыялістаў самасвядомасці.

Яноўскі М.З.,
дацэнт

## МАСТАЦКА-ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І ПСІХАЛАГІЧНЫ ЎЗРОСТ

Пры дыферэнцыраваным вымярэнні ўзросту чалавека ў біялагічным, сацыяльным і псіхалагічным аспектах узнікае перш за ўсё праблема мноства нарматыўных крытэрыяў, у адпаведнасці з якімі магчыма атрыманне інтэгратыўных узроставых паказчыкаў. Найбольш востра гэта праблема стаіць пры даследаванні псіхалагічнага ўзросту.

У псіхалагічнай навуцы пакуль што няма дастатковых надзейных крытэрыяў супастаўлення асобных вынікаў псіхалагічнага ўзросту. У значнай ступені гэта абумоўлена гетэрахроннасцю (розначасовасцю) функцыянальных і асабістых змен жыцця індывіда.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры ўзнікненні праблемы ўзросту, якая прынята ў псіхалогіі, практычна недаследаваным застаецца пытанне аб суб'ектыўных адносінах чалавека да ўласнага ўзросту, аб тым, якім чынам суб'ектыўная хранaлагічная мера часу жыцця трансфармуецца ў самаацэнку ўзросту, вызначаную ў паняцці асобы на аснове абагульняючага адлюстравання асаблівасцей жыццёвага шляху цалкам і асобных яго этапаў.

Часцей за ўсё мы вызначаем узрост чалавека, арыентуючыся не на колькасць гадоў, якія ён пражыў, а на сваё ўнутранае пачуццё.

Задачай даследавання было высвятленне асаблівасцей суб'ектыўнага паняцця свайго ўзросту ў сувязі з заняткамі розымі відамі мастацка-творчай дзейнасці. Пры гэтым зыходзілі з таго, што мастацка-творчая дзейнасць асобы (музычна-вакальная, харэаграфічная, тэатральная і інш.) выключна актыўна танізуе эмацыянальную сферу чалавека, сенсібілізуе яго пазнавальную, фізічную актыўнасць, змяняе працаздольнасць нервовай сістэмы цалкам. Гэта не можа не адбіцца на своеасаблівасці адчуванняў псіхалагічнага ўзросту асобы. Жыццёвая практыка пераконвае, што ў радзе абставін, і асабліва на фоне розных псіхічных станаў, чалавек можа перажываць і адлюстроўваць свой рэальны біялагічны ўзрост па-рознаму, змяняючы яго ў вобразе псіхалагічнага «Я» шляхам змяншэння ці павелічэння рэальных межаў.

Праз самаацэнку і мысленнае ўяўленне мы прапанавалі падвыпрабавальным суб'ектыўна вызначыць свой узрост эмацыянальны, фізічны, па знешнасці.

Параўноваліся вынікі рэальнага біялагічнага ўзросту ўдзельнікаў эксперымента з псіхалагічным узростам па трох вылучаных паказчыках. Адначасова ў даследаванні ставілася задача вызначыць межы змянення псіхалагічнага ўзросту падвыпрабаваных выкладчыкаў у працэсе прафесійнай дзейнасці з калектывамі рознага тыпу, г.зн. на рэпетыцыях. У даследаванні прымалі ўдзел 81 чал. (40 чал. ва ўзросце 30--40 гадоў і 41 чал. ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў).

Вынікі даследавання паказалі, што толькі ў 17% апытаных ва ўзросце 20--30 гадоў суб'ектыўная ацэнка ўзросту супала з узростам па эмацыянальнаму кампаненту, у 24% -- па знешнасці і 26% -- па фізічнаму кампаненту. Большасць жа апытаных (69%, 67%, 55%) лічылі сябе больш маладымі, чым гэта было ў сапраўдкасці; у 14%, 22%, 14% па крытэрыях эмацыянальнаму, фізічнаму, па знешнасці адпаведныя самаацэнкі ўзросту аказаліся завышанымі, г.зн. падвыпрабавальныя адчувалі сябе старэйшымі. Сярэдняя абсалютная розніца паміж суб'ектыўнай ацэнкай і рэальным узростам склала па эмацыянальнаму крытэрыю 5,2 г., па фізічнаму --4,8 г., па знешнасці - 4,3 г.

Найбольш выражанымі ў суб'ектыўнай ацэнцы псіхалагічнага ўзросту ў бок яго змяншэння выявіліся змены ў даследаваных ва ўзросце 30--40 гадоў. Таму па эмацыянальнаму крытэрыю сярэдні вынік зніжэння склаў 10,5 г. у 85%, адпаведнасць біялагічнаму ўзросту адзначылі 4 чал. (10%). Па фізічнай прыкмеце сярэдні вынік зніжэння псіхалагічнага ўзросту склаў у гэтай групе 7,1 г. у 75% (30 чал.), адэкватная ацэнка адзначана ў 6 чал. (15%), у 4 чал. ацэнка ўзросту адзначана больш высокая, чым рэальны ўзрост.

Па знешнасці (выгляду) у гэтай групе ўдзельнікаў эксперымента на больш нізкі ўзрост ў самаўспрыманні ўказалі 29 чал. (72%), у сярэднім на 7,5 г., адпаведны сабе ўзрост назвалі 8 чал. (20%), і толькі 3 чал. гэтай групы вызначылі сябе крыху старэйшымі свайго біялагічнага ўзросту.

Удзел у мастацка-творчым працэсе, на рэпетыцыях, выклікае унутранае пачуццё зніжэння ўзросту інтэгральна на 7,7 г. Але ў нязначнай частцы ўдзельнікаў эксперымента назіралася адваротная тэндэнцыя, якая характарызуецца жаданнем бачыць сябе ў працэсе рэпетыцыйнай работы трошкі старэйшымі.

У даследаванні былі выяўлены тэндэнцыі: з узростам значна павялічваецца колькасць асоб, якія ацэньваюць сябе больш маладымі, чым у сапраўднасці; назіраецца яўная неадпаведнасць у ацэнках узросту па эмацыянальнасці, знешнасці і фізічнаму стану здароўя; мастацка-творчая актыўнасць найбольш выразна зрушвае суб'ектыўнае самаўспрыманне ўзросту асобы па эмацыянальнасці -- мастацкая дзейнасць у мікрацыкле фарміруе суб'ектыўнае адчуванне сябе маладзей рэальнага, біялагічнага ўзросту.

Прыведзеныя факты сведчаць аб тым, што недастаткова вывучаны развіваючыя магчымасці мастацтва ва ўзняцці самасвядомасці асобы, у тым ліку на сацыяльна-псіхалагічным узроўні.

Самойлаў А.А.,
прэзідэнт Беларускага цэнтра

## СІСТЭМА РЭЙКІ ЯК МЕТАД АЗДАРАЎЛЕННЯ І АКТЫВІЗАЦЫІ ТВОРЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ АСОБЫ

За доўгую гісторыю чалавецтва існавала шмат спосабаў лячэння, што грунтаваліся на адкрыцці і перадачы Універсальнай Жыццёвай Энергіі, якая нараджае і падтрымлівае ўсё жывое сусвету. Так, тыбетцы ўжо тысячагоддзі таму назад валодалі глыбокімі ведамі аб духу, матэрыі і энергіі. Яны выкарыстоўвалі гэтыя веды, каб лячыць сваё цела, сваю душу. Аналагічнымі ведамі валодалі людзі ў старажытнай Індыі, Кітаі, Егіпце, Грэцыі, Рыме і іншых краінах.

Сучасныя вучоныя часта натыкаюцца на пакінутыя папярэднімі пакаленнямі сляды гэтых глыбокіх ведаў, але нярэдка тлумачаць іх памылкова, бо цяжка прачытаць знойдзеныя дакументы. Такім чынам, доўгі час здавалася, што разуменне Рэйкі згублена.

У канцы 19 стагоддзя японскі ўрач Мікао Усуі знайшоў ў 2500-гадовых фаліянтах санскрыту ключ да Рэйкі, што прывяло да адраджэння гэтай тысячагадовай традыцыі прыроднага (натуральнага) аздараўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ